ВОЛЬНАЯ БЕЛАРУСЬ

Цэна асобнаго № 15 кап.

Умовы падпіскі на 1917 г.

За 1 м.	За 2 м.	За 3 м.	За 4 м.	За 5 м	За 6 м.	За 7 м.	За 8 м.	За 9 м.
1 р.	2 р.	3 р	4 р.	5 р.	6 р.	7 р.	8 р.	9 р.

Падпіска прымаяцца толькі с 1-го чысла кожнаго месяца.

Перамена адрэсу—50 коп. Пры зьмені адрэса конча прыкладаць стары адрэс.

Рукапісы павінны быць чытэльна напісаны і толькі з аднаго боку паперы. Кепска нерапісаныя рукапісы ні чытацца, ні друкавацца ня будуць.

На ліставання, перасылку рукапісаў і іншыя адказы-павінны прыкладацца маркі.

Газэта палітычная, эканамічная і літэратурная.

Год выданьня I.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Мінск, Захараўск. 18

Умовы друку абвестак:

(На IV боку газэты) за 1 радок шпальту 40 к. за 2 раз. 80 к. за кожны раз.

Асобам, шукаючым працы — 1 руб. за 3 радкі за адзін раз.

№ 28. 1917 г. Серада Выходзіць двойчы на тыдзень. 8 лістапада 1917 г. № 28.

Таварышы і грамадзяне!

На выбарах да Устаноўчага Сойму па Міншчыні і Віленшчыні галасуйце за сьпісак

№ 13. **№ 13.**

Беларускай Сацыялістычнай Грамады.

Сацыялістычная грамада выстаўляе гэтакіх кандыдатаў:

1] Прутынскі Александр Владзіміраў,—беларускі паэт, адбыў 9 год ссылкі за землю і волю народа. [Мінск, 2-я Мікалаеўск, 6].

2] Петроўскі Базыль Петраў [Масква, Перэведзероўка, 12].—Работнік і літэратор. Родам с Капыля.

3] Лёсік Язэп Юркаў, [Мінск, Захараўск., 18].

4] Жылуновіч Зьмітрук Тодароў, [Петроград, Знаменская, 36-54.] Работнік. канторшчык. Беларускі пісьменнік. Родам с Капыля.

5] Міхайлоўскі-Рак Сымон Александраў, салдат, X арміі, вучыцель.

6] Мамонька Язэп Алексеяў, салдат, XII арміі. Родам са Случчыны.

7] Тарашкевіч Броніслаў Адамаў, [Петроград, Знаменская 36-54] Сын селяніна с-пад Вільні, кандыдат філолёгіі.

8] Турук Тодар Тодароў, [Масква, В.-Лубянка, Зрэценск., 6]. Вучыцель Мінскай гімназіі. Родам з Новагрудчыны.

9] Адамовіч Вячаслаў Антонаў. [Мінск, Міхайлоўская, 21]. Даўнешы рэдактар «Сѣверо-Запад. Телеграфа».

10] Бадунова Палагея Алексадроўна [Мінск, Захароўск., 18]народн. вучыц.

11] Міцкевіч Канстантын Міхалаў [Якуб Колас] Видомы паэт Беларусі з Мікалаўшчыны, Мінскага пав. падпаручык 292 Александ. полку.

12] Остроўскі Родаслаў Казіміраў, Слуцк. Камісарыят. Вучыцель с Случчыны, беларускі працаўнік.

13] Смоліч Аркадзі Антонаў, агроном, родам з Бабруйскага павету, беларускі дзеяч.

Да працы.

Братэ! вялікая дарога
Чакае нас і родны край.
Настало жніво, працы многа.
Навукі зерня засевай!
Нясеця сьвет—у змроку дрэмле
Наш мілы край, наш родны кут.
Ніхай ўваскроснуць нашы землі,
Ніхай асьвеціцца наш люд!
Дапомаж Бог вам у прыгодзі!..
Ні царскі біч, ні прышлы хам,—
Хай будзе лад ў сваёй гасподзі
Ствараць народ—ўладарац сам.

Якуб Колас

Паустанне і нашыя заданні.

Карыстаючы з агульнадзяржаўнаго безладдзя і жаданьня у салдатаў ніадкладнаго міру, «большэвікі» распачалі ў Петраградзі паўстанне, арыштавалі Часовы Урад і забралі уласьць ў свае рукі. Яшчэ змаганне за ўладарство ў дзяржаві ні скончано,—па гарадох ідуць бойкі, льецца кроў, руйнуюцца гістарычныя помнікі і культурныя здабыткі і трудна праве упэўніцца, чым гэта скончыцца, але згоадно ясно, што ні «большэвікі», ні згодна складзянае міністэрство і ні жадны іншы урад з Масквы ці с Петраграду установіць парадку ні можа. Ні установіць яго і той агульнадзяржаўны устаноўчы сойм, на каторы дзе-хто пакладае надзеі і да скліканья каторага так млява і нідбала гатуюцца. Надзеі апошняго часу засланілі установчы Сойм, і калі нават ён і ні разабьецца а скелі палітычнаю бурай і сабярэцца у тэрмін, дык кожнаму відочна, што ён нікога ні здаволіць, парадку ні установіць, і нічога ні зробіць, як нічога ні зрабіла т. з.Рада Рэспублікі, пабудованая па прынцыпу вялікадзяржаўнаго цэнтралізму.

Хто дбае аб культуры, хто стаіць за грамадзкі лад, за дэмакратызм і еднасьць дзяржавы расійскай, той мусіць адказацца ад надзеі завядзэння парадку с цэнтру і рашуча стаць на грунт фэдэралізму. Палітыка дзяржаўнаго цэнтралізму валтузіць поступ грамадзянскаго адбудавання, спрые авантурнасьці, і ні водзін народ Расіі ні можа памірыцца з дыдактурай вялікарускай народнасьці, каторая ні здолала яшчэ прабудзіць у сябе пачуцця нацыанальнаго самапазнання.

Палітыка ураду Керэнскаго і «прэдпарлямэнту» паказала ясна, што паразумення адтуль чакаць ні прыходзіцца. Расійскі «большэвізм» спрые нацыанальным дамаганьням і повян жаданя здаволіць самыя крайнія дэмакратычныя вымогі, але нідоля яго ў тым, што ён ні жыццёвы, ні мае грунту і асуджан на знішчэнне. Тут дапраўды справядлівы словы: падняўшы меч, ад меча і згіне. Становішчо с кожным днём горшае і выйсьце з яго толькі адно: як найхутчэйшае скліканне паасобных краёвых устаноўчых соймаў. Украінцы, беларусы і вялікарусы, казацтво, Сібір і усе абьедналыя крае здолаюць кожны паасобку утварыць лад і грамадзкі парадак, а упарадкаваўшы дома, патрапяць устанавіць і агульнадзяржаўны парадак праз сваіх прэдстаўнікоў у Маскве ці ў Петраградзі.

Краёвыя соймы ў трывожны час дзяржаўнай калатніны зьяўляюцца канечнай патрэбаю дэмакратычнаго захісту і захавання тых правоў і вольнасьцяў, каторыя намі здабыты такім коштам і напружэнням грамадзкіх сіл. Хваля рэвалюцыйнасьці дайшла да астатняй магчымасьці і па моцы законаў падзення адхлыне назад с такою ж шпаркасьцю, з якою шугалася ўперад. І ніхто с пэўнасьцю ні можа сказаць, дзе само, у яком мейсцы, па якой палітычнай камбінацыі яна супыніцца. І толькі краёвыя соймы могуць устрымаць хвалю контр-рэвалюцыйнасьці і захаваць дэмакратычныя заваевания. У гэтым—ядыны ратунак, ядынае выйсьце с таго скрутнаго становішча, у яком апынуліся мы, дзякуючы дзяржаўнаму цэнтралізму, прышчэпляному расійскай дэмакратыі самадзяржаўным панаванням.

Краёвая Беларуская Рада стала на чаргу дня і кліча на работу усіх, хто любіць свой край, хто жадае яму лепшай сьветлай будучыны і ні хоча загінуць у моры безладдзя, калатні і занепаду.

Я. Л-к.

II-я сэсія Цэнтральнае Рады Беларускіх арганізацый.

Дзень другі. 16. X. 1917 г.

Салдат Мамонька, прэдстаўнік XII арміі робіць даклад аб зьездзі беларусаў XII арміі. На зьездзі было каля 1.000 чалавек і ухваляна гэткая дэклярацыя: 1] фэдэрацыя, 2] роўнапраўство моваў; 3] скліканне нацыанальных устаноўчых соймаў і 4) прэдстаўнік ад Беларусі на мірнуй канфэрэнцыі.

Я. Варонка, перад тым, як зрабіць даклад агульна-палітычнай камісіі, расказвае, што ў Петраградзі часта склікаліся мітынгі дзеля пашырэньня нацыанальнай сьвядомасьці сярод беларусаў. На адном польскум мітынгу, каторы быў зроблян П. п. с., прамоўляў беларус. Пасьля яго прамовы выступіў з патоўпу адзін чалавек і, кепска гаворачы па-польску, сказаў, што ён сягодня мае вялікае шчасьце, бо даведаўся, што ён—беларус. Гэта выклікало гучную авацыю.

Паводлуг дакладу Я. Варонкі, агульна-палітычная камісія апрацавала гэтакі праэкт. Мейсцо апрацавання аўтаноміі Беларусі павінно быць там, дзе жыве Часовы Урад, але перш, каб прымусіць урад прызнаць аўтаномію Беларусі, павінна быць утворана Вялікая Беларуская Рада. Збудаваць яе трэба іначай, як пабудована украінская Рада. Нам трэба мець сваіх консулаў пры кожнум міністэрстві, апрач таго—у Кіеві, Маскве і Стаўцы. Рада павінна мець Выканаўчы Камітэт, каторы будзе складацца з загадчыкоў асобных спраў: культурна-прасьветн., палітычнай, ваеннай, бежанскай і т. д.

Дзень трэці. 17. X. 1917.

Гэты дзень застанецца нізабытным днём у гісторыі беларускаго руху. На агульнум пасядзэнню Рада прызнала патрэбным утварэнне Краёваго Органу пад назваю Цэнтральная ці Вялікая Беларуская Рада. На тлумачэньню прамоўцаў назва «Вялікая» будзе перакладацца на расійскую мову словам «Большая».

У Раду Народаў, каторая заложана зьездам Народаў Расіі у Кіеві, абабралі Краскаўскага І., Прушынскага А. і Фарботку Я.

Даляй. разважаецца пытанне аб арганізацыі краёваго органу і аўтаноміі краю. Рада павінна абьявіць сябе правамоцнаю і бараніць увесь беларускі народ. Дзеля гэтага трэба мець свой сэкрэтарыят і сваіх консулаў пры важнейшых міністэрствах. У Мінску сэкрэтарыят складаецца с 6-і загадчыкаў, а консулаў пры міністэрствах—8. Трэба кінуць палітыку карактрасьці, настаў час голасна абвесьціць, хто гаспадар на Беларусі. Што датыча праэкту аўтаноміі, то камісія прызнала, што аўтаномія прыдзе да нас сама па сабе, як скутак працы Беларускае Рады.

У гэты момэнт устае селянін Бычкоўскі і кажа, што нам трэба сваё войско, бо бяз войска мы нічога ня зробім. Дзеля гэтага, нашае войско павінно стаяць у нашым краю. Палякі у нас маюць сваё войско, а у нас німа. Заява Бычкоўскаго выклікае спачуцце.

Краскоўскі кажа, што трэба браць у свае рукі усё, што можна узяць, а можна узяць справу прасьветную, культурную, харчовую, бежанскую і т. д. У Мінску губэрнскім камісарам выбралі ворага беларускаго руху. Нам трэба змагацца з гэтым, а гэта павінны зрабіць нашы прэдстаўнікі пры Часовым Урадзі.

Смоліч прапануе зьвяртаць больш увагі на гісторыю, а гісторыя вучыць, што ні варта рабіць таго, што потым прыдзецца браць назад. Кожнаму ведама, што улада ні даецца бяз барацьбы. Яму адказвае Прушынскі: «Мы чакалі 7 месяцаў. Да нас зьвяртаюцца і пытаюць, калі мы возьмем справу у свае рукі. Мы будзем чакаць, а справа сама ні пасунецца. Трэба зрабіць той т а р а н для беларускае справы, каторы-б прабіў гэты мур нірухомасьці. І гэта зробіць краёвы орган нашых арганізацыяў.»

Латышэнка просіць прабачэння, што будзе гаварыць па-расійску, бо змаленства яго вучылі гэтак, і ён покі што кепска гавора па-беларуску, але ні ад слова залежыць праца. Трэба працаваць. Уцекачы на Арлоўшчыні зарганізоваліся і хочуць бачыць Беларусь аўтономна-фэдэратыўнаю. Трэба дабівацца, плён будзе. Цяпер расійскі цэнтралізм хоча апёрціся на чырвоны сьцяг. Мы павінны дабівацца аўтаноміі. Кропля прабівае камянь ні сілаю, а частатою капання. Калі кажуць, што ні час закладаць Краёвую Раду, дык памыляюцца. Трэба ісьці крокам нормальнаго чалавека,—ні скакаць, але і ні таптацца на мэйсцы. Яго падтрымлівае Я. Лёсік і кажа, што пара прышла; німа чаго чакаць, бо «покі сонцо ўзыдзе—раса вочы выясьць». Хтось прапануе вітаць Лёсіка, рэдактара «Вольнае Беларусі». Усе ўстаюць і бьюць ў далоні. «Шчыра вам дзякую, шаноўнае грамадзянство, за ушанаванне, адказвае Лёсік—я цьвёрда веру, я пэвян у тым, што беларускі рух набярэ хутка вялікай сілы і праз Раду пойдзе да Вялікай Краёвай Беларускае Рады, каторая абвесьціць: уся зямля працоўным людзям, а ўся ўласьць на Беларусі—беларускаму на-

БЕЛАРУСЫ-ВОІНЫ ЗАХОДНЯГО ФРОНТУ НА ВЫБАРАХ ДА

рэду!» (Апладысмэнты).

Адказваючы тым, хто выступаўся проці утварэння Цэнтральнае Беларускае Рады, здавальняючыся Цэнтральнаю Радаю Беларускіх арганізацыяў, Я. Варонка гаворыць «Пачакайце!»—казалі нам да рэвалюцыі. «Пачакайце! кажуць нам і цяпер. Пачакаць кліччуць нас і тыя, хто павінны уззяць тое, чаго нам ні хочуць даць». Посьля гэтага прапанацыя аб утварэнні Цэнтральнага Беларускага органу ставіцца на галасаванне і прымаецца у прынцыпі. Посьля галасавання П. Бадунова устае і кажа, што мусіць ні чыё так сэрца ні радае, як яе. Плача і ні можа далей гаварыць. Краскоўскі прапануе ухваліць праграму склікання на 18-е кастрычніка Беларускага вайсковага зьезду: 1] арганізацыя ваеннай сілы, 2] дэмобілізацыя, 3] адбудаванне краю, 4] выбары да Установчага Сойму, 5] Цэнтральны орган вайсковае Рады і 6] пытанне аб вайне і міру. Дзеля прывітання вайсковага зьезду выбралі: Я. Дылу, Варонку, Бычкоўскага, Прушынскага, Лагашэнку і Бадунову.

В. Н. Самойло заяўляе, што Кузьмін-Караваеў—камісар заходняга фронту,—спрые утварэнню нацыянальнаго беларускаго войска. Як намоцнік мінскага камісара, Саймойло паведамляе, што памешкання для вайсковага зьезду німа і яго німа дзе рэквізаваць. Пастаноўлено Радой, што зьезд адбудзецца у памешканні камісарыяту, дзе адбываецца і сэсія Рады.

Апошні дзень. 24. X. 1917 г.

З 18-24 кастрычніка афіцыяльна Рада ні працавала, адбываліся толькі прыватныя пасяджэнні. Члены Рады былі заняты працай на вайсковым зьездзі. На прыватных пасяджэннях абгаварваліся грашавыя справы, прадстаўніцтво у дзяржаўных установах, намячаліся кандыдаты у Выканаўчы Камітэт, або т. з. Малую Раду. Паміж іншым разглядалася прапанова склікаць ІІІ-ю сэсію Раду у цэнтральнум пункці Беларусі. Прапанаваўся г. Орша, Магіл. гб. Падымалося пытанне аб тым, каб газэту «Вольная Беларусь» зрабіць органам Рады, але да паразумення ні прышлі. Згадзіліся на тым, што газэту трэба надтрымаць, а выдаўцам застаецца «Таварыство Беларускае Культуры».

Астатняе пасяджэнне адбылося а 10 гадзіні ранку злучна з выканаўчым вайсковым камітэтам, каторы к гэтаму часу зарганізаваўся. Спачатку разглядаецца «Пастанова аб Цэнтральнай Радзі, яе функцыі і арганізацыя». Спярша па пунктам, а потым агулам «пастанова» прымаецца аднагалосна. Далей, сэсія пераходзіць да арганізацыі выканаўчага камітэту Рады, або Малоі Рады. Вайсковы зьезд утварыў свой выканаўчы камітэт і пастанавіў, каб гэты камітэт злучыўся з выканаўчым камітэтам Рады. Каб ні было механічнаго злучэння, уносіцца прапазыцыя: «Згодна з ухвалаю Вайсковаго Зьезду члены Вайсковаго Выканаўчаго Камітэту уваходзяць у Б. Р. і тым самым становяцца членамі Рады і разам выбіраюць Выканаўчы Камітэт Вялікае Беларускай Рады». Прапазыцыя прымаецца пры 4 ч. устрымаўшыхся і двух проціў. Далей галасуюцца і прымаюцца гэтакія пункты: 1] Вялікія Б. Р. мае законнасьць, калі большасьць абъеднаных Радаю арганізацый прыслалі сваіх делегатаў. Кворум Рады складае большасьць $^{1}/_{2}$ прыехаўшых делегатаў. 2] Выканаўчы Камітэт В. Б. Р. складаецца з 24 членаў, абраных Радаю. Кворум—$^{2}/_{3}$ усіх сябрукоў. 3] Выканаўчы Камітэт з 9-ю камісарамі складаюць Малую Раду з 33 членаў. Кворум Малае Рады—$^{2}/_{3}$ членаў. Ні члены Рады могуць быць членамі В. Камітэту, калі яны належаць да тэй ці іншай беларускай арганізацыі. 4) Камісары адпаведальны перад В. Б. Радаю, іх адклікае Выкан. Камітэт $^{2}/_{3}$-і галасоў пры паіменным галасаванні і замяняе іх новымі па своему дасьведчэнню і нагляду да склікання сэсіі Рады. Камісары складаюць калегію з выбарным старшынёю і адпаведальны калегіяльна. 5] Камісары працуюць у поўным кантакці з В. Камітэтам, праводзяць у жыцце іх пастановы і адпаведальны перад Малаю Радаю. Ініцыятыва склікання Малоі Рады належыць Выканаўчаму Камітэту, а ў экстрэнных выпадках—большасьці камісараў. 6] Выканаўчаму Камітэту надаецца право каоптацыі.

Выслухваюцца і прымаюцца рэзалюцыі па бежэнскаму, культурна-прасьветн. і інш. пытанням, а ўсе ні разгледжаныя пытанні даручаюцца Выканаўчаму Камітэту. Ухвалено Раду называць Вялікаю Беларускаю Радаю. Ваенны камісар абіраецца В. Кам. Вайсковае Рады.

Камісары: ў Маскве—Я. Дыло; грашавых спраў, промыслу і гандлю Б. Сталыгва, асьветы—Тарашкевіч, юстыцыі і ўнутраных спраў Я. Варонка, па бежэнскім справам—П. Бадунова; працы і харчавання Зм. Жылуновіч; у Кіеві—І. Краскоўскі і т. д. Кандыдатамі камісараў: Радзевіч і Душэўскі.

Каля 4-е гадзіны а поўначы сэсія Рады зачынілася.

Успамінкі.

Лепшы успамінак майго жыцьця—мой вучыцель вясковы. Душа яго была сьветлая, сэрца поўна любасьці да нас, дзетак. Сабяромся, бывала, абступім чародкай свайго вучыцеля—яго хмуры твар сьвятлея, вочы гараць нейкім агнём, глядзяць на нас ласкава. Чаго толькі ні нагаворыць ён нам, куды толькі ні завядзе наш дзіцячы вум, сэрца! І любілі ж мы нашаго вучыцеля, душы ні чаялі ў ім! Прыбяжыш дамоў, залезяш на печ —думкі ужо далёка, ужо там, дзе больш шчасьця, дзе людзі з вясёлай усьмешкай. І начуваеш вялікую моц у сабе, хочыцца вясьці спорку за долю, палепшыць жыцьцё, што скавала ланцугамі нядолі цёмнага вяскоўца; як найскарэй атшукаць ворага, як найскарэй звоеваць яго.

Мы усе добра ведалі, дзякуючы вучыцелю, што толькі вучэнне адкрывае вочы чалавеку, што толькі навука вядзе да сьветлай сьцежкі, да праўды... Вучыцца і вучыцца, быць гэткім, як вучыцель, усё ведаць!..

Вот і сэмінарыя. Ловіш каждае слово, чакаеш адказу на пытаньня, што узварушаны даўно. Яго німа. Прыходзяць вучыцелі, але яны чужыя, ім мала клопату да таго, чаго запрашае вум і сэрцо нашае.

Доўга чакаў я, спадзеваўся, але надзея ні споўнілась. Зьяўляліся у блішчастых гузіках, выслухоўвалі вурокі, прызначалі новыя. І гэтак да канца. Ні разу ні водзін ні зачапіў нашага сэрца, нават нарокам. Яно спала, стравы яму ні было.

І дзіўна было і крыўда панавала. Падгатаўляюць да працы у вёсцы, нам аддадуць дзетак, іх кволыя душы,—а чаму ні разу ні чулі мы добрага слоўца аб іх, чаму ні даложаць старання, каб разварушыць любашч да іх, узмацаваць яе? Чаму ніхто ні скажа, як пазбыцца крыўды, вывясьці на сьвет цёмную вёску? І гэта тое самае вучэнне, гэта той самы Божы прамень, да якога цягнуліся нашы дзяцінныя душы, слухаючы свайго вучыцеля?...

Сядзіш у клясі, слухаеш гузікі, з-за якіх выглядае мой добры, сьвяты вучыцель. Твар яго маркотны, вочы поўныя нуды, грудзі цяжка уздымаюцца. Хочацца шчыра абхапіць яго шыю, прыхінуцца да яго сэрца і сказаць: згадаў, ведаю, што тут нічога мне ні дадуць; але жыццё навучыць, якой сьцежкай ісьці, толькі яно... І пайду, дарагі, пайду за табою, тваім сьледам, ўсё аддам таму гаротнаму народу, якога жыццё—праклёны!..

Мала было для вума, нічагутка сэрцу. А час бег, пытання узбольшваліся. І вот хватаюся за кнігі, у вялікіх пісьменнікаў шукаю таго, чым залячыць можна раны, якіх ні хацелі, ці то ні умелі лячыць нашы кіраўнікі.

Туга ішла навука; толькі частка насувалася уперад без страшэннай працы. Ніпаўды было пачуць, напрыклад: «лісьця у слівы сенціментальные». Усё трэба было браць памяцціцю, «зубрежкай». Здавалі вурокі, адтрымоўвалі і больш нічога...

Вучыліся тут усё дзеці беларусаў. Але ні разу ніхто не абмовіўся аб гэтым ці водным словам, калі ні лічыць вось гэтага здарэньня. Адказваю я вурок аб расьлінах. Вучыцель Лукашэвіч з Ма-

АНТОСЬ ЛАТА.

Зьява другая.

(Ноч у лесі. Ціш, жуда. З глыбіны лесу нясуцца ніясныя, таемныя зыкі. Крычыць сава: «Кі-гі! кі-гі!» У пушчы як бы хто-сь пераклікаецца: Гу-гу-гууу!» З-за хмар калі-ні-калі выплывае месячык ды зноў нырае у хмаркі. Антось, Габрусь і Рыгор ідуць праз лес. Гарэлка водзіць Антося у бокі. Габрусь і Рыгор падтрымоўваюць яго.)

Антось. Стойця!.. стойця, сакалэ мае турэцкія! (Упіраецца, падаецца назад. Усе застанаўляюцца. Антось перастае дзівачыць, пільна углядаецца ў лес).

Рыгор. Тут у дзень нічога ні убачыш, а дзядзька у ночы хочыш нешта згледзіць.

Габрусь. Хадземо, дзядзька, памалу.

Антось. (Ціха, спаважна, нікога ні слухаючы). А ці ні здаецца вам, хлопцы... (прыслухіваецца) Ссс!.. (падымае палец у гору. Габрусю рантоўна робіцца чагось страшна).

Габрусь. Ну, пашоў ужо варьяцець! Даўно пара быць дома... (да сябе). Згарэла-б яна, гэта гарэлка, і вы разам з ёю!

Антось. А ці ні здаецца вам, сынэ мае, што мы ні па тэй дарозе ідом, га? (Усе узіраюцца на дарогу).

Рыгор. Здаецца—тая, а можа і ні тая!

Габрусь. (З усьмешкаю) А ці ні ўсё роўна нам? Мы даўно бадзяемося ні па тых дарогах, кудою ходзяць добрыя людзі.

Антось. Унъ куды гне, злодзяй! (Бье злёгка па яго плечу). Ты праўду кажыш сын мой: сышлі нашы калёсы з калеінаў. Ну, і чорт іх бяры: як ні пакоцяцца, а за манапольку зачэпяцца. [Сьпевае.]

«Ой хадзем да дому, Зарэжамката,
Ні скажам нікому, Бо наш кот—сірата.»

Габрусь [Злосна]. Ні вый ты, дзядзька: ваўкоў яшчэ пасклікаеш.

Антось. Гэ, брат, ціперашнім сьветам лепш з ваўкамі жыць, чым з людзьмі, бо што цяпер чалавек? Ноль! пацяруха!

Габрусь. Ну, годзі, годзі! Пойдзем, дзядзька!

Антось. [Штось успомніўшы]. Стой! стой! А я такі склічу ваўкоў, паваблю іх! Колісь, брат стражнікаваў, с князямі на мядзьведзяў хадзіў. О-о-о! [Бяжыць з дарогі у гушчар і вые па-воўчы, згарнуўшы кулаке ў трубу. Габрусь і Рыгор слухаюць. Антось вые, як воўк; вые доўга, сперша ціха, потым ўсё усіляе голас і канчае страшным, жудасным завываннем].

Габрусь і Рыгор [разам] Кінь, дзядзька, бо ні добра слухаць—німа чаго жартаваць з імі.

Антось. (Сумна) І воўк у лесі ні хоча адгукнуцца мне.

Габрусь. [Цягне Антося за рукаў]. Ну, хадземо, дзядзька, даволі дзівачыць!

Антось. Ідзі, друж! ці ж я цябе трымаю? А мне некуды. Каму я патрэбны!? А патрэбян,—то той і сам прыдзе да мяне, калі я яму патрэбян буду. [Памаўчаўшы]. Душа мая баліць, косьці скрыпяць, і кішкі бурчаць; трэба зрабіць папаску—ногі ні служаць. Садзіся, кампанія мая, чуць ні родная [садзіцца па дол, мацае кішэні]. Захапіў с сабою жывучай і гаючай вады. [Дастае бутэльку з гарэлкай]. Во яна!

Габрусь [плюе і сярдзіта адварочваецца]. А каб ты смалы напіўся! Ну, кінь, дзядзька! дома вып'еш. [цягне Антося, той вырываецца].

Рыгор. Ну, ніхай сапачыне чалавек. Што ты прыстаў, як смала? Ні табе, здаецца, равесьнік (Ласкавей). Пасядзімо крыху, пакурымо, сапачынем. (Садзіцца каля Антося, Габрусь адыходзіцца ад іх, разглядае мейсцо).

Антось. Ну, Рыгор: здароў будзь! [цягне з бутэлькі]. Вантробы яна ужо мне папаліла.

Рыгор. То на вошта яе піць?

Антось. [Ціха]. Ні магу... Ты ні ведаеш гэтага [Стукае ў грудзі]. Баліць у мяне, ссе мяне нешта, душа ные! Нейкі злы дух залез сюды і ні дае мне спакою! О, Божэ літасьцівы! Дакуль будзе пакута мая? [Апускае галаву].

Габрусь. [Пакідае кампанію, ідзе па дарозі, прыглядаецца, прыслухіваецца]. Не,—зоймешся з імі, ніколі да дому ні трапіш. Але і праўда, ці тая гэта дарога? А спытаць німа у каго. (Раптоўна астанаўляецца: ў перадзі ніясна абазначаецца фігура. З мроку выходзіць чалавек, пад пахаю торба, ў руках палка, ідзе падскокам, высока падымае ногі і громка тупае; зямля глуха аддае крокі нівядомаго). Адкуль, чалавечэ?

Нівядомы. З багны—балота, з сухога чарота, дзе чэрці сьвятых спакушаюць.

Габрусь. (Спалохаўшысь). Ні ведаю, што гаворыш, чалавек! Ты мне скажы, куды зайду я, пайшоўшы па гэтай дарозі?

Нівядомы. На могілкі.

Габрусь. На якія могілкі?

Нівядомы. А на тыя, адкуль ніхто назад ні ходзіць.

Габрусь. Тьфу, згінь ты! (Хрысьціцца).

Нівядомы. А мне перадалі гасьцінчыку для цябе. На! [Згартае і дае Габрусю у нос-фігу].

Габрусь. [Адскаківае. Нівядомы ідзе далей, заліваючыся ціхім рогатам]. Божэ мой! Куды зайшлі мы! [Ідзе да Антося і Рыгора. Антось сядзіць, як акамянелы, Рыгор ляжыць на сьпіні. Да Рыгора]. Рыгор, уставай, браток: Бог ведае, куды мы зайшлі. Тут страшнае мейсцо, і Бог адступіўся ад яго—тут прайшла здань, а можа і сам д'ябал; ўласныя вочы мае бачылі яго!

Антось. (Падымае галаву, абводзіць вачыма селян і лес). Ты кажаш: «Куды мы зайшлі?» Вот тут і ёсьць точка! Хіба ж мы самі зайшлі? Нас вёў нехта, а мы, як сабакі на ланцугу, пакорна ішлі за ім.

Габрусь. Што ты, дзядзька! Ахамяніся!

Антось. [рантоўна зрываецца з мейсца, сьціскае кулаке, скрыгічэ зубамі, крычыць нема]. Вон! вон яе адгэтуль! (Бяжыць, як бы каго ловіць і хочэ рынуцца на яго).

Рыгор. [Трасе Антося] Дзядзька! дзядзька! Перахрысьціся ты, Бог с табою!

Антось. Я задушу яе, згубу маю!

Рыгор. Каго? Гэта у цябе здань, дзядзька, з гарачкі [Габрусь трасецца, як асіновы ліст, хрысьціцца сам і хрысьціць Антося].

Антось. Цеш, дзеткі, цеш! [Злосна]. Адступіся ад мяне: я душу прадаў чорту!

УСТАНОУЧАГО СОЙМУ ГАЛАСУЙЦЕ ЗА СВОЙ СЬПІСАК № 4.

гілёўшчыны (астатні час інспэктар пачат. шк. Рэчыцкага пав.) пытае: «Чаму вы гаворыце па-беларуску?» Сьпыўся і і ні магу згадаць, у чым справа. Цераз колькі дзён ізноў: «Вы усё па-беларуску? Няўжож ні можэця па-руску?» А у вочах гэтулькі злосьці, нейчага гідкага, што аж страшна стала... Беларускі язык, рускі язык... Што гэта? У чым жа праступак, калі я уставіў колькі слоў, якія скрось чуваць у вёсцы, якія прамаўляе мой бацька? Хочаця зрабіць тое, каб матка ня зразумела мяне, калі загавару дома? Гэта у вас на мэце? Ад страшэннага болю, сьлёзы набеглі на вочы...

Скончылася навука. Выйшлі мы на працу з сэрцам, куды ні закінулі ніводнага шчырага слоўца, с сэрцам, ніпачатым. Мы ішлі у вёску чужыя, ішлі рабіць зьдзек сваім бацьком, братам, таптаць бруднымі нагамі роднае. I ні дзіва, што з гэткай ахвотай і стараньням шпурлялі гразьзёю на з'ездзі настаўнікаў туды, адкуль выйшлі, зракліся сваёй мовы. Гэта усё стварыла школа. Не дзіўлюся я цяпер, калі чую: «мы беларусы, бо некалі насілі белыя сьвіткі, бо былі белыя-русыя, але ня хочам свайго языка, бачым сваё збаўленьня у маскоўцаў». Яны цышуць тым, што ўбілі ім у голаву жывасілам. Іх вочы нічога ні бачылі і ні бачуць, акром гвяздаў і тлустай лусты. Затым і даюць цяпер народу цемру заміж сьвядомасьці... Народ сам адшукае сваю сьцежку і зрачэцца павадыроў, гэтых чужых яму людзей. I замест падзякі пашле праклёны перакіншчыкам, зраднікам!..

ст. Замірье. Зрэбны.

ПОКЛІЧ.

Каля нас бушуе моро,
Хвалі хлешчуць церав край:
Разам ўсё заварушылось
I крычыць: маё мне дай!
Украіна стала вольнай.
Кажа фін: я аддзялюсь,
Мне ні трэба больш алекі.
Я й без руса абайдусь.
Польшч даўно ўжо адлучылась,
Адхіснулася, ўцякла,
Успамінаючы пра тое,
Над Масквою як жыла.
Латышы, літоўцы, эсты,—
Як бы там ні мала іх,—
А і тыя закрычалі:
Будзем жыці без чужых.
Але моро так бушуе,
Так хвалюецца, шуміць,—
А нас бытцам ні чапае;
Усё маўчыць і ціш стаіць.
Беларусь наша сьвятая
Чагось думае, маўчыць,
Нібы спіць сабе, ні дбае,
I ні просіць, ні крычыць.
Ты маўчыш, мая старонка,
Чаму-ж так? Скажы ты мне?
Чаго жджэш? Здаецца сонцо
Засьвеціло у вакне.
Ці у цябе німа раднога,
Або прошласьці німа,
Што ні хочаш ты нічога
Мая родна старана?
Не, дасюль цябе, здаецца,
Ні пакрыўдзіў Бог саўсім:
Есьць свая культура, мова,—
Пахваліцца ёсьць нам чым!
Але будучы ў уціску
У сваіх братоў родных,
Ты сваё усё забыла,
Стала наймітам у іх.
I цяпер, як рух падняўся,
Як стаяць ўсе на сваём,
Ты адна ўсё спіш, старонка,
Летаргічным, моцным сном.
Дык прасьніся, мая маці,
Паглядзі каля сябе,—
Зноў цябе пакрыўдзяць людзі,
Зноў пакінуць у бядзе.
Загукай усім ты моцна,
Што жывеш на сьвеці ты,
Што й табе прышла свабода,
Што ні хочаш крыўды ты,
Пад свой сьцяг чырвоны-белы
Пасклікай усіх сыноў,
Параскіданых па сьвеці,
Каб варталіся дамоў.
Мае сябры-беларусы,
Адгукнецеся, братке:
На пазоў свае матулі
Сабірайцеся ў гуртке!
Пад яе зышоўшысь сьцягам,
Будзем з горам ваевацъ,
Будзем дома працаваці,
Сваю хату будаваць!

Дворчанін.

У забранай Беларусі.

Нідаўна трапілося мне чуць, як адзін доктар, прабыўшы тры годы у палоні, апаведаў у т. варыстві лекароў аб жыцці у немцаў і аб тым, як жывуць там літвіны і нашы беларусы.

Цяжка жыць палонным: галадна і нудна. Трэба быць надта шчасьлівым, каб уцячы с палону. Мала таго, што ўсе лагеры, дзе трымаюць палонных, абгароджаны вісокімі сьценамі, дык іх абнесьлі калючым дротам і абкопалі глыбокімі канавамі. Апрач таго, выдуманы яшчэ асобныя грошы, каторыя маюць цану толькі у пэўным лагеры, а за яго сьцяною нічога ні варты,—іх ніхто ні бярэ, і уцякач, каб трапілося, ні могбы купіць за іх кавалка хлеба. Шмат ёсьць хворых сярод палонных. Лечаць іх, пабольшасьці, свае палонныя дактарэ. Усюды страшэнная нуда, убогія на кожным кроку.

Як толькі немцы займуць якое место ці вёску, дык зарад-жа перапісваюць усіх жыхароў і кожнаму выдаюць за пэўную плату пашпарт с партрэтам яго ўласьніка. Бяз гэткага пашпарту ніхто ні мае права выйсьці нават на вуліцу. Усе старэйшыя 15-і гадоў, плацяць падаткі за сябе, за зямлю, за дом і т. д., а хто ні можа плаціць, той ідзе на скарбовыя работы,—сячы лес, праводзіць шасу і т. д. і жыве там, як палонны. Працуюць ад цёмнага да цёмнага. Плацяць рубель на дзень, але вылічаюць за харч, кватэру і т. д. і на рукі даюць 15-30 капеяк. Калі такіх работнікаў ні выстарчае, дык бяруць сілком усіх здаровых, хто можа працаваць, і мужчын і жанок.

Коні, здольных да працы,назабіралі; грошы за іх ні плацілі, а навыдавалі квіткі і кажуць, што заплаце руская казна. Былі і такія здарэнні, што забіралі коні, а потым прысылалі паперу, склікалі народ ды чыталі, што той ці інны генэрал ці палкоўнік «дзякуе за ахвяру нямецкаму войску». Забралі і быдло; часам астаўлялі карову, але с тэй умовай, каб аддаваць пэўную частку масла. Адбіралі і пташтво,—коратка кажучы усё, што магло згадзіцца для ваенных патрэб. Калі астаўлялі курыцу, то за гэта трэба было плаціць што тыдня пару яек.

Забіралі збожжо і астаўлялі толькі на пражыццё. Калі кто хоча прадаць збожжо, дык мусіць мець дазваленне, але прадаваць павінян толькі управі, а управа адсылае на фронт. Калі гаспадар хоча закалоць парсючка, ці баранчыка, то так сама павінян мець дазваленне; лепшыя кускі рэквізуюць.

Усюды заведзяна кругавая парука: за беднаго плаціць падаткі грамада, а гэтак сама грамадаю плацяць і штрапы. Калі у каго знойдуць уцекача палоннаго, накладаюць вялікі штрап; калі сам гаспадар ні можа заплаціць—плаціць уся грамада. Дзеля гэтага жыхары пільна глядзяць адзін за другім.

Немцы назабівалі сабак і катоў. У Вільні ні ўгледзіш сабакі. Зрабілі яны гэта с тэй прычыны, што сабак і катоў трэба карміць. Ні відно і варон. Немцы ядуць іх самі і раюць людзям есьці, а хто ні хоча, той павінян іх забіваць ды прысылаць да управы, гдзе плацяць 25 кап. за маладую, 13 кап. за старую варону.

Заведзяна асобная манэта,—так сама рублі, капейкі, але маюць іншы выгляд; напісы на грашах—па-нямецку, парускy, па-польску, па-літоўску, па-беларуску ні відно. Расійскія грошы прымаюць ахвотна.

Землю,—адвечныя нашыя пяскі, выробляюць так, што даюць добры ураджай нават там, дзе у нас ні было-б нічога. Унівэрсітэт у Вільні адчынілі, але, кажуць, што ніхват прафэсароў і студэнтаў. Папастаўлялі новыя школы, але ні хапае настаўнікаў.

А. Цэхановіч.

Габрусь і Рыгор. [Адскаківаюць, як апараныя] Што ты?.. А Божэ!..

Антось. (Углядаецца у цемянь) Вот яна, во! (паказывае рукою на гушчар). Стаіць, халернае мясо!

Габрусь. (Да Рыгора) Ты бачыш? Там хто-сь стаіць... варушыцца!

Рыгор. (Хаваецца за сьпіну Габруся). Пан Бог з намі, Дух Сьвяты! Тфу, згінь, прападзі! (Усе ў трох пазіраюць у лес. З гушчару павольна зьяўляецца жанчына. Ні рук яе, ні ног, ні твару ні відаць. У колькі кроках цень застывае).

Антось. Чаго ты прышла сюды? Што табе тут трэба?

Здань. А як табе сказаць? Прыйшлі мы да цябе на суд.

Антось. Хто—мы?!

Здань. Я і яна.

Антось. А чорт вашаго бацьку і маццеру ведае! Мала на сьвеці ўсякіх патаскух?

Здань. Ой, як ты лаешся! А яшчэ добры знаёмы!

Антось. Які я твой знаёмы? Брыда ты!

Здань. Ха-ха-ха! Вот табе і на! Ды ты ж без мяне ні воднага дня ні пражыў; ты, калі хочэш, крыху мой бацька.

Антось. А прападзі ты, такая дачушка!

Голас з лесу. Захочэш—і прападзе. Мяне то ты ні знаеш, але я ніадступна сную за табою, як твая цень, як верная служка твая; кожную мінуту шапчу я табе: «Кінь, Антось, сваю патуру, будзь ты чалавекам!

Антось. А гэта што яшчэ за прыяцель такі?

Здань. А ты і разваж нас... Мы даўно ужо калоцімся з ёю. Я—Манаполька, я—Выпіваха; яна—Цьвярозая пані.

Антось. [Трэ лоб]. Ну, загадаюць загадку, хоць Вэрку з бубляю кліч на падпамогу.

Здань. Гэта цьвярозая імасць пілуе мяне і пілуе. «Ты,—кажа—людзкая згуба, ты—нішчасьце людзкае.» Так гэта, ці не? Скажы па-праўдзі, Антоне: калі табе весяла і ты сьпяваеш—ці тагды, калі ты пьяны, ці тагды, як ты цьвярозы?

Антось. (Хітрую). Ні заўсюды чалавек сьпявае з радасьці. Быў у мяне знаёмы, дзяк Ральkоўскі, царство яму нябеснае: той сьпяваў заўсюды, бо ён з гэтага хлеб еў. Раз, беднаго, падашукаў Антось Лузун. Панёс прадаваць дзякавы боты, каб разам прапіць іх. Боты то ён прадаў, але прапіў іх бяз дзяка—і панюхаць таму ні даў. Пашоў дзяк хаваць умарлага, стаіць у выступках,—холадна, троха ні плачэ, а цягне: «Со святымі супакой!»

Здань. Ты ні тое гаворыш, што думаеш. Ну, што ж? Людзі заўсюды забываюць дабро. Але ж трэба быць справедлівым. Хіба забыўся, да каго прыхіляўся ты, калі табе было горка на душы? Помніш—быў пажар? Усё пагарэло, сам выскачыў з хаты, у чым стаяў, чуць жывымі былі выхвачаны дзеці, ні было за што рук зацяць, і ты хадзіў пануры, як бы на табе зямля лежала. А людзі вакруг былі так чэрствы на тваё горо, так чэрствы! I душа твая ачэрствела, аціьвярдзело тваё сэрцо, Божы сьвет стаў табе ні мілы, і ні рад быў ты жыццю. А хто усцешыў цябе? Хто адагрэў тваё сэрцо? Цьвярозым ты мейсца ні знайходзіў сабе, а выпіў—ты стаў другім чалавекам, і сьвет адмяніўся, і горо тваё пакавалося жартамі.

Антось (стаіць унурыўшыся). Нечага сказаць, жыў Антось Лата, рай было яго жыцьце. У-у-х! У друзачкі пабіць... (пакорна). А каго?--(Схіляе голаў).

Рыгор. Згавары ты, дзядзька, пацеры і супакойся: гэта нічыстая сіла чмуціць цябе.

Габрусь. (Цягне Антося за руку). Хадзем бордзінька з гэтаго заклятаго мейсца!

Антось. Малецяся вы, а мяне Бог ні ўчуе. Грэшны я, сакалэ мае: і турэцкі бог ні захочэ з Антосям кампанаваць (махае рукамі). Адчапецяся ад мяне, хлопцы: я ўсім хачу насы уцерці, і сам смаркатым застаўся.

Здань. Дык ці можна разлучацца нам с табою, мой дружэ, калі мы так моцна зьвязаны! I ні адно здарэнне у тваім жыцьцю ні адбывалося без мяне. Першы твой крык, каторым ты спатыкаў жыцьце, далетаў і да маіх вушэй, і я шла, як добрая госьця, і несла с сабою радасьць для ўсіх. Са мною заўсюды весялей, бо я разагрэваю кроў, адганяю сумныя думкі і развязываю язык. Ні наладзіцца справа, клічуць мяне, і я усіх пагаджу... Скажы ж, чалавечэ, ці маю я права на пашану людзкую?

Антось. (Круціць галавою). Складна гаворыш, як у сьцяну лепіш. Была у мяне рыжая сучка, то і тая так ні брэхала (рагочэ) Эх, Антось, Антось! Раскідаеш ты залатыя слоўкі, але хто зьбярэ іх? Паслухайця-ж мяне, мае прыхільныя прыяцелькі. Быў на сьвеці музыка-дудар. I меў ён дудку, ды такую прыўдалую і так яна жаласна іграла, што без плачу ніхто ні мог яе слухаць: такое сэрцо уложыў у яе дудар. Дык заўсюды іграла яна жаласна. А калі хто хацеў весялейшых сьпеваў, то для тых у дудку укладалі другое сэрцо... Ці была гэта дудка шчасьліва?.. Ты адбірала у мяне маё сэрцо, налівaючы вантробы мае гэтаю атрутаю... Чуеш ты? Я клічу у сьведкі гэту сляпую ноч, гэты лес адвечны, месячык ясны і далёкія зоры: будзь ты праклята! На вечныя векі праклінаю цябе, чортава служка!.. У апошні мой час вы прышлі насьміхацца з мяне. Вам мала насьміханьня над цэлым маім жыццем. (З ні сваёю сілаю вырываецца з рук селян, і як пружына кідаецца на здань і падае на дол... Пачынае сьвітаць, ў лесі шарэе. Антось ляжыць, ні варушыцца. Габрусь і Рыгор падбегаюць да Антося)

Рыгор. Дзядзька, дзядзька!

Габрусь. (У дзікім страху) Ніжывы! (Антось ляжыць ніцма. Габрусь і Рыгор стаяць паобапал, пазіраюць адзін на другога).

ЗАСЛОНА.

Тарас Гушча.

Віленская газэта „Товарищъ."

Выпадкова трапіў да нас адзін нумар віленскае газэты «Товарищъ.» Гэта быў № 62 ад 28-га кастрычніка. Газэта выдаецца на расійскай мові. Ні рэдактара, ні умоваў на падпіску у ёй ні абазначано. Газэта мае чыста інфармацыйны характар, што і зауважано у падзагалоўку. «Гэтая газэта, пішацца там: мае на мэці азнаямленне чытачоў з важнейшымі падзеямі, зьвязанымі з вайною. Першым чынам адрукуюцца афіціяльныя весткі, апрач таго, выпіскі з газэт усіх партыяў, як абоіх варожых хаўрусаў, так і нэйтральных дзяржаваў.»

Цікава, што газэта грунтоўна азнаёмляна з усім чыста, што робіцца у Расіі. На першым мейсцы выдрукована радіограма аб тым, што петраградзкі гарнізон і пралетарыят скінуў урад Керэнскаго. Даляй ідуць паведамлення штабаў: гэрманскаго, аўстрыйскаго і расійскаго; весткі з Італіі, з Францыі (перадрук з № 50, 13.х. «Салдата») і з Расіі. У вестках з Расіі гаворыцца пра дымісію Цэрэшчэнкі, вайсковага міністра, пра Леніна, пра М. Горкаго, каторы зьвяртаўся з заклікам трэбаваць замірэння, пра расійскую міліцыю, каторая ні можа утрымаць парадку і пра агульнае безладзе у Расіі.

Усе весткі тэндэнцыйныя і зазначаюць толькі тое, што ворагі гэрманцаў патомляны і хочуць міру: толькі пра немцаў нічога ні пішыцца. У раздзелі фэльетону друкуецца «Французская рэвалюцыя» Д. Бертоллоти. Да паведамлення аб італійскіх ніудачах дададзена карта (мапа).

Аб тым, як ідзе жыцце у забранай Беларусі і што робяць у Вільні пашы браты-беларусы— у газэці жадных вестак німа, хаця з другіх чутак ведама, што беларускі рух там расьце і выдаецца беларуская газэта «Гоман.»

ХРОНІКА.

Грамата
да Беларускаго Народу.

Браты-беларусы, працоўны народ Беларусі, работнікі і селяне-земляробы, беларусы-ваякі, усе, каму дарагая воля і рэвалюцыя, усе, у кім гарыць і бьецца сэрцо за правы і волю беларускаго народу!

Грамадзяне усіх іншых народаў, якія жывуць на пашай зямельцы!

Прышоў момант, якога ні ведае гісторыя нашае многапакутнай зямлі. Воляй рэвалюцыі мы пастаўлены перад патрэбай сабраць усе жывыя сілы нашае Бацькаўшчыны дзеля абароны і утрымання нашых вольнасьцяў, здабытых крывёй мільёнаў сыноў пакрыўджанай, бяздольнай Беларусі.

У гэтыя дні нам належыць паказаць запраўды, што злучаная пакутай беларуская рэвалюцыйная дэмакратыя ні дапусьціць, каб віхор бязладу згубіў нашую сьвятую нацыянальную справу абароны вольнасьцяў і правоў Беларускаго Народу.

Браты-Беларусы, працоўны народ, сыны зямлі і абаронцы вольнасьцяў Бацькаўшчыны! Злучыцеся у адну згодную сямью каля Вялікай Беларускай Рады, адкідаючы ад сябе сеючыя нізгоду поклічы і будзьце асьцярожнымі у сваіх дзеях. Толькі парадак і згоднасьць паміж усімі, паможа нам утрымаць спакой у нашым краі, а еднасьць з войскам надыйме дух і злучыць увесь народ.

Браты-Беларусы! Вялікая Беларуская Рада, апіраючыся на Цэнтральную Вайсковую Раду, Беларускі спаўняючы Камітэт Заходняго фронту, на усе беларускія арганізацыі, верыць у сілу і мудрасьць беларускаго народу, у руках каторага вялікая будучына Вольнай Беларусі, воля, зямля і згода.

Вялікая Беларуская Рада.
Часовая Цэнтральная Беларуская Вайсковая Рада.
Беларускі Спаўняючы Камітэт Заходняго фронту.
Беларуская Соцыялістычная Грамада.
Беларуская Народная Партыя Соцыялістоў.

МІНСК-БЕЛАРУСКІ.
27 кастрычніка 1917 году.

У Выканаўчым Камітэці.

31-го кастрычніка адбылося звычайнае пасядзэнне В. Камітэту Вялікае Рады. На павестцы дня стаялі: даклады загадчыкаў адзелаў і, пам ж іншым, адносіны да газэты «Вольная Беларусь.» Усе даклады, якія чыталіся, і прамовы, якія гаварыліся, у большасьці вяліся на расійскай мові. За вылучэннем 3—4 сябрукоў Камітэту, рэшта гаварыць па-беларуску ні умея. Трэба думаць, што гэта зьявіско выпадковае і с часам беларуская мова запануе там, дзе яна павінна горда зычэць і красавацца. Людзі, стаўшыя на чале беларускаго руху, павінны навучыцца і чытаць, і пісаць, і гаварыць па-беларуску. На праціўны выпадак, яны, самі таго ні бажаючы, будуць руйнаваць аднэй рукою тое, што пабудуюць другою. Гэта так, і пасылацца на прыклад сіоністаў нам, беларусам, ні выпадае...

Жыцце нашае зложылося так, што калі беларус прыватна размаўляе папольску, дык гэта лічыцца безумоўна дрэнным; але калі беларус без канечнай патрэбы гутарыць па-расійску, дык гэта лічыцца звычайным і даганы ні выклікае. Трэба быць справедлівым, а гэтай справедлівасьці мы дасягнім тагды, калі будзем трымацца свайго роднаго. беларускаго.

З дакладаў выслухан быў даклад П. Бадуновай, загадчыцы па бежэнскім справам і па справам дапамогі ахвярам вайны і страціўшым працаздольнасьць. Чакалі дакладаў з другіх аддзелаў, але яны ні былі яшчэ падгатованы. Каоптованы у загадчыкі аддзелу прасьветы, Я. Лёсік, заявіў, што ён ахвотна згаджаецца працаваць прыватным і звычайным сябруком аддзелу, але адмоўляецца быць яго загадчыкам, матывуючы гэта тым, што ён, як ніабраны сябрук, ні можа узяць на сябе жаднаго загаду. Выканаўчы Камітэт мае право каоптаваць карысных для справы людзэй.—тлумачыў даляй Лёсік: гэта право ёй надано Радаю, але у самой Радзі дзе-хто голасна выказваўся проці яго кандыдатуры у В. Камітэт і ніхто с тых, хто цяпер стаіць за яго каоптацыю ні пратэставаў. Такім чынам, яго кандзідатура, сабраўшы толькі 4 голасы, была правалена на Радзі. На моцы гэтаго, ён ні лічыць для сябе магчымым увайсьці ў склад В. Камітэту праз каоптацыю і, тым больш, згадзіцца быць загадчыкам таго ці іншаго аддзелу. Сабранне, выслухаўшы гэту заяву, аднастайне ухваліло выбраць іншаго загадчыка адзелу прасьветы.

Што датычэ пытання аб адносінах Камітэту да газэты «Вольная Беларусь», то с прамоваў пагарджаных выявілося, што дзе-хто сярод сябрукоў Камітэту абразіўся перадавым артыкулам, выдрукаваным у № 27 нашае газэты і, як гэта часта бывае, перанес сваю асобістую абразу на ўсю інстытуцыю. Адзін с сябрукоў Камітэту, дык нават вышукаў у нашым артыкулі «сэпаратызм», знайшоўшы яго у выразі «паднявольнае суседзтво з Масквою». Тут ужо дапраўды, калі хто баіцца, дык с куста зробіць воўка,—страх і цемра маюць вочы шпаркія. Разьвіваючы сваю думку, ён, паміж іншым, зазначыў, што Беларусь заўсюды жыла паднявольным жыццем,—то пад Маскоўшчынай, то пад Польшчай (!), і тут нічога ганебнага німа, а калі паднявольнае жыцце з Масквою падкрэсьліваюць, дык тут ужо сэпаратызм... Маскоўцы могуць спаць спакойна,—яны маюць добрых абаронцаў сваіх цэнтралістычных пажаданняў!

Рэшта-ж тапталася на тым мейсцы стацці, дзе гаварылося, што «сярод сябрукоў Камітэту пападаюцца элямэнты саўсім выпадковыя». І за гэта рыхтаваліся пакараць газэту. Асабліва горача і старанна увіхаліся каля гэтага А. Смоліч і П. Бадунова. Апошняя, да рэчы сказаць, ні чытаць, ні гаварыць пабеларуску ні умея. Яе-то, мабыць, мала абходзіць росквіт беларускаго друкованаго слова, ні дарма-ж яна аднокраць вы славілася, што-такоі бяды, калі ні будзе беларускае газэты і, развважаючы па сабе, дадала: «её всё равно никто не читаетъ». І цяпер, плаваючы у каламуці дэмагогіі, яна абражано гукала, што «падрукаваўшы стаццю проціў нас, ні любіць свайго краю. Гэта, гэта»... і т. д. Відаць было, што яна і лічыла сябе тым выпадковым, зацікаўленным дэмагогічным уплывам, элямэнтам, што трапіў у В. Камітэт. Смоліч,—дык той ставіў пытанне руба: мы—або газэта, і німа ведама, чым-бы справа кончылася, каб гэты судовы трыбунал ні быў перапынян. Устаў Тарашкевіч і заўважыў, што ніхто ні мае права судзіць газэту за яе погляды, і гэта пытанне трэба зьняць с павесткі дня.

Прасілі «дать свои показанія» і рэдактора. Хтось зацікавіўся псэўданімам прэступнаго артыкулу. Але цікавасьць гэта ні была здаволена.

Рэшта пасядзэння прайшла у разглядах бягучых спраў. Чарговая парада В. Камітэту была назначана на той час, калі вернецца с Стаўкі дэлегацыя, каторая паехала туды па справам легалізацыі цэнтральнай вайскавой Беларускай Рады і арганізацыі беларускаго войска.

Смутак.

Арганізацыйны сход вучняў беларусоў.

5-го кастрычніка адбыўся арганізацыйны сход вучняў-беларусаў. Сход адбыўся ў памешканні Вялікае Беларускае Рады. Ухвалено арганізаваць усіх вучняў-беларусаў, дзеля пашырэння нацыянальнай сьведомасьці і культурна-прасьветных заданняў.

АПОШНІЯ НАВІНЫ.

Паўстанне.

1-го лістапада. У Маскве безперапанку вялася канонада; у цэнтры гораду вялікія зруйнавання. Разгромляны гарэлачныя склады. Па краёх гораду пачаліся галодныя бунты.

Ц. К. Пачтова-тэлеграф. хаўрусу пагражае абвесьціць забастоўку, калі ні будзе супыняно братабойство і складзяно згоднае сацыялістычнае міністэрство.

Як паведамляе Воен. Рэвалюц. Камітэт, казакі у Гатчыні перайшлі да«большэвікоў» Гатчыну «большэвікі» забралі. Арыштован ген. Красноў, Войцінскі і штаб Керэнскаго. Сам Керэнскі уцёк. На запытанне, дзе дзеўся Керэнскі, б. міністр землябства адказаў: «ушелъ, куда нужно.» Ад імяні казакоў, Ваен. Рэвал. Камітэту, Рады Камісараў і Ц. И. К. здбіты тэлеграммы з наказам арыштаваць Керэнскаго.

Адозва Генэральнаго Сэкрэтарыяту Украіны.

Да войска і грамадзян Украіны. На Украіні льецца кроў. Адны часьціны войска ідуць проці другіх. Сярод войска і мірнай людпасьці вялікія ахвяры. Работа па харчаванню фронту і тылу прыпынілася, тым часам як краю пагражае голад. У Кіеві на вуліцах ідзе бой.

Генэральны Сэкрэтарыят Украіны, найвышэйшая краёвая улада, у імя ратунку роднага краю, вымагае, каб усе часткі войска і ўсе грамадзяне зараз жа перасталі нападаць адны на другіх. На Украіні німа з-за чаго вясьці крывавую барацьбу. Украінская Цэнтральная Рада абрана усімі народамі Украіны і выслоўляе волю усяе рэвалюцыйнай дэмакратыі. На істоці гэта і ёсьць краёвая рада селянскіх, работніцкіх і салдацкіх дэпутатаў. Усё войско і усе партыі павінны прызнаваць уладу Генэральнаго Сэкрэтарыяту Украінскае Цэнтральнай Рады і цалкам карыцца яго наказам.

Даволі праліцця крыві!

Хто будзе даляй вясьці крывавую барацьбу, той вораг роднага краю і рэвалюцыі.

Кіеў. 31.х.1917 г.

Голас Кіеўшчыны.

Галава кіеўскай украінскае губэрнскае Рады ад імяні губэрнскаго зьезду прывітаў Цэнтральную Раду і прачытаў такую ухвалу гэтаго зьезду: «Выслоўляючы глыбокае абурэнне і рашучы пратэст проці пастановы казацкаго зьезду у Кіеві пра захват улады на Украіні і беручы на увагу, што здабыткам рэвалюцыі на Украіні пагражае вялікая нібязпека, зьезд рашуча дамагаецца:

1] каб усю уладу на Украіні узяла у свае рукі Цэнтральная Рада;

2) каб Цэнтральная Рада абвесьціла Украіну Дэмакратычнаю Рэспублікай і рупна прычынілася да утварэння Расійскай Фэдэрацыі;

3] каб усё расійскае войско нібаўна вывязено было з Украіны і заменяно было украінскімі вайсковымі часткамі, каторымі мае парадкаваць Генэральны Вайсковы Камітэт;

4) каб нібаўна склікан быў Украінскі Установчы Сойм;

5) каб усе падаткі на Украіні, а гэтак сама даходы з дзяржаўных земляў і іншаго майна, наступалі у распараджэнне Цэнтральнае Рады;

6] каб усе камісары на Украіні былі перавыбраны і надлягалі паслушэнству толькі Генэральнаго Сэкрэтарыяту.

Апрач таго, зьезд радзіць зьвярнуцца да украінскаго народу з адозваю, каб, дзеля ратунку справы рэвалюцыі, народ усімі заходамі падтрымоўваў урад—Цэнтральную Раду—і рабіў усе магчымыя ахвяры на нацыянальны фонд золатам, срэбрам і іншымі дастаткамі, а пры патрэбі каб аддалі на Фонд і дарагую цэркоўную утвар і нават палавіну званоў з усіх званіцаў.»

Рэдактар Я. Лёсік.

Выдавец: «Т-во Беларускай Культуры».

Друкарня Н. М. Нахумова, [старэйшаго.]